# ГЕАМЭТРЫЯ ЖЫЦЬЦЯ

На кожным лапіку зямлі, за выняткам хіба Антарктыды, па чарзе жылі розныя народы. І, напэўна, усе яны ўяўлялі сябе апошнімі, назаўсёднымі. Але, здаецца, няма такога племя, якое б дажыло да нашых дзён ад самага пачатку гісторыі. І мы не апошнія на гэтай зямлі: яна глыбейшая за нашую радзіму.

У стане эмбрыёну кожны з нас адчувае сябе цэнтрам сусьвету, часова абмежаванага целам маці. Нават пасьля нараджэньня мы яшчэ доўга ўяўляем сябе гаспадарамі дому і галавою сям'і. Дзяцей вельмі цяжка прымусіць стаяць у чарзе побач з дарослымі: яны хочуць мець усё адразу. Але чым больш жыве чалавек, тым лягчэй пагаджаецца на ролю другаснай, пэрыфэрыйнай істоты.

Мы складаем сваё жыцьцё зь фізыялягічных працэсаў, учынкаў, словаў і думак. Аднак зь іншага, неантрапацэнтрычнага гледзішча ўсё наадварот: людзі нараджаюцца і паміраюць, а словы гаворацца тыя самыя; у лякарні зьмяняюцца хворыя і дактары, а самі хваробы застаюцца; чалавек нічога не стварае і ня думае сам: за яго гэта робіць нехта іншы — мова, багі, машыны ці расклад зорак на небе. Франц Кафка аднойчы занатаваў у дзёньнік: "Канвэер жыцьця нясе чалавека кудысьці — невядома куды...". Гэта так, але ці не зьяўляецца і сам чалавек нейкім канвэерам, што нясе кудысьці фрагмэнт сьвету, які выпадкова набыў абрысы ягонага цела?

Амаль штодня мы паўтараем адны і тыя ж думкі, словы, рухі цела. І ў гэтым карагодзе аднолькавых дзён і гадоў чалавек аднойчы можа зрабіць адкрыцьцё, што ён жыве сьледам не за кім-небудзь, а за самім жа сабой — жыве, так бы мовіць, за ўласнаю сьпінай.

Паводле вядомага фізычнага закону, цела ня падае, пакуль яно захоўвае хуткасьць, а найспрытней мы робім тыя справы і вымаўляем тыя думкі, у якіх нічога новага для нас няма. Найбольш шматлюдная траекторыя мысьленьня і жыцьця — рух па коле з аднолькавай хуткасьцю. Калі чалавек рызыкне абагнаць самога сябе, ён можа заляцець невядома ў якія высокія сфэры. Аднак часьцей людзі падаюць са звыклай арбіты ня ў неба, а ўніз, на зямлю. Чалавек падае, калі ў яго не стае сілаў нават на тое, каб жыць сёньняшнім днём, калі ўспаміны робяцца для яго даражэйшымі за думкі пра будучыню.

Цывілізацыя чэргаў робіць нас падобнымі да Сызыфа, што з дня ў дзень на мяжы духоўных і фізычных сілаў штурхае па заганным коле шчарбаты камень свайго лёсу. Па дарозе на працу, на антыўрадавы мітынг альбо ў краму напярэдадні чарговага павышэньня цэнаў мы заўсёды трошкі спадзяемся, што гэта будзе "наш апошні і пераможны бой". Але ўжо назаўтра, ледзь прачнуўшыся, мы зноў запрагаемся ў тыя самыя цуглі. Штодня мы ходзім амаль што сьлед у сьлед па адных і тых жа тратуарах і сьцяжынках у траве, патроху сьціраючы ў пыл ня толькі падэшвы, але і саму плянэту.

З дня ў дзень адну і тую самую працу выконваюць і мурашы, і дрожджы, і тыя расьліны, што вытвараюць для ўсіх нас кісларод. Ніякай трагедыі ў гэтым няма, бо яны ніколі ня думаюць пра тое, што маглі б жыць неяк інакш. Сонца таксама штодня ўзыходзіць на неба без аніякіх сумненьняў, сьвяціць нам альбо заняцца сёньня чымсьці іншым. На думку Альбэра Камю, міт пра Сызыфа трагічны, бо "Сызыф, пралетар багоў, ведае пра бясконцасьць сваёй журботнай долі; пра яе думае ён падчас спуску з гары за сваім камянём...". Напэўна, пра штосьці падобнае задумваецца часам і кожны рабочы, калі ідзе дахаты праз заводзкую прахадную. Таму і збочвае ў бар, каб кульнуць пару куфляў піва.

З пэўнага гледзішча можна заўважыць, што нашае цела коціцца па жыцьці нібыта гімнастычнае сальта. Прынамсі, аднойчы на суткі чалавек кладзецца адпачыць, каб потым зноў падхапіцца і бегчы на працу, і за ўсё жыцьцё ён пасьпявае зрабіць дзясяткі тысячаў такіх абаротаў вакол свайго жывата.

Зразумела, узьнімацца і падаць уласьціва ня толькі целу, але і духу. Грэх і пакаяньне — зачараванае кола кожнага верніка.

Леў Шэстаў задаваўся пытаньнем, ці не паходзіць частка людзей ад Адама і таму ўсё жыцьцё пакутуе, чагосьці шукае, да нечага імкнецца, а другая частка — ад бязгрэшнае малпы, і таму задавальняецца малым і нічога ў іхнай душы не баліць.

Нашчадкі Адама мараць здабыць “жорава ў небе”, нашчадкі ж малпы задавальняюцца “сініцай у руках”, але ўтрымаць яе таксама няпроста! У прастытуткі ня менш праблемаў, чым у паэта ці навукоўца. І малпа, і Адам (альбо Ева) жывуць у кожным з нас. Чалавек харчуецца прадуктамі зямлі, але дыхае небам. Абодва варыянты выбару паміж прыземленым і прынябёсным ладам жыцьця могуць сьведчыць пра трагедыю чалавечага духу, прыкутага да сызыфавай долі. Паводле філязофіі Сартра, паміж сініцай у руках і жоравам у небе мы мусім выбіраць жорава — нават калі ведаем, што ніколі ня здолеем да яго дацягнуцца. Зь іншага боку, Камю раіць нам спыніць выбар на сініцы — нават калі няма надзеі, што можна пераtварыць яе ў нешта лепшае.

Біялягічнае цела прымушае нас жыць на нейкай цьвёрдай гарызантальнай паверхні, у той час як душа кліча нас у неба, за шэрыя хмары. Цялеснасьць і пэрпэндыкулярная ёй духоўнасьць — вось сыстэма каардынатаў, што стварае прастору чалавечай істоты. Найвышэйшая каштоўнасьць для цела — само жыцьцё, а для розуму і душы — несьмяротнасьць, заслужыць якую даволі праблематычна без ахвяраваньня інтарэсамі цела і нават самім жыцьцём.

Высокія парываньні ўласнае душы альбо дзяржаўнае ідэалёгіі заклікаюць чалавека ўзьняцца над сабою і дацягнуцца да зорак у небе. Зь іншага боку, інстынкты настойліва раяць нам не вытыркацца, жыць як мага бліжэй да трывалага грунту, на якім шмат корму і самак. Духоўнасьць ратуе нас ад пажыцьцёвага зьняволеньня ў коле фізыялягічных працэсаў, цялеснасьць — ад пераtварэньня яшчэ пры жыцьці ў набор лічбаў і словаў. Сьвятары кажуць, што цялеснае жыцьцё — стан паўшага чалавецтва. Але хто ведае — ці ня ўпадзем мы яшчэ ніжэй бяз нашых целаў? У апраметную, напрыклад.

Арыстотэль тлумачыў, чаму чалавек такі разумны, тым, што ён на сваіх дзьвюх нагах далёка адарваўся ад зямлі. Чатырохногія жывёлы існуюць амаль што лежма, яны занадта блізкія да пылу зямнога і праз гэта губляюць здольнасьць да мысьленьня. (Калі спускацца па “арыстотэлевай лесьвіцы” біялягічных відаў далей уніз, можна ўбачыць, як чатырохногія пераtвараюцца ў шматногіх, потым у бязногіх і, нарэшце, у расьліны, укаранёныя ў глебу.)

Палову свайго жыцьця мы адбываем лежма. Палова чалавецтва — ляжыць: дастаткова падлічыць тых, хто зараз сьпіць, хварэе, займаецца сэксам, тэлегледачоў і немаўлятаў. Палова людзей ляжыць, тым часам як другая штосьці робіць, штосьці кажа ці думае, шукае ці нішчыць. У лінгвістычным пляне пазагістарычнаму стану “лежма” адпавядае маўчаньне.

Сядзець — таксама напалову ляжаць. І нават калі мы стаім альбо кудысьці ідзем, то абапіраемся звычайна толькі на палову нашых ног (дакладней — на

адну нагу), другая ж у гэты час адпачывае. Каб паскорыць суб'ектыўны бег часу (напрыклад, у чарзе), многія людзі кладуць рукі ў кішэні альбо на нейкую апору ці скрыжоўваюць іх на грудзях, схіляюць галаву і заплюшчваюць вочы. Нават калі мы стаім — часткова ляжым, калі размаўляем — недаслухоўваем і самі ня ўсе словы кажам асэнсавана.

Сучасны чалавек валодае добра калі паловаю словаў і граматычных правілаў нават той мовы, якую лічыць роднай (мне, напрыклад, хацелася б думаць, што самых прыгожых і карысных словаў я яшчэ ня ведаю). Але і мова валодае толькі часткаю чалавечай істоты — узроўнем рэгулярна ўзнаўляемых звыклых думак і жэстаў.

Ёсьць падставы меркаваць, што чалавек выжыў на нашай зямлі (у адрозьненьне, магчыма, ад іншых плянэтаў), таму што навучыўся ня толькі стаяць, але і ляжаць, ня толькі прамаўляць, але і маўчаць, навучыўся адпачываць ад цяжару гісторыі і ўласнага лёсу ў гульні, сэксе і сьне. Тыповы савецкі жарт: "Лепш жыць лежма на сэксуальным партнэры, чым паміраць стойма ў вагонах і чэргах".

У таталітарным грамадзтве чалавек ратуе сумленьне тым, што знаходзіць магчымасьць адляжацца на бальнічным ложку падчас чарговага сходу, дзе трэба цягнуць руку ўверх, галасуючы за далейшае ўмацаваньне рэжыму. Улада вымушаная ісьці на кампраміс зь фізыялёгіяй і глядзець скрозь пальцы на тое, што яе рабы штовечар выключаюць тэлевізар, каб паглядзець у ложку непадцэнзурныя сны. Ёй дастаткова, што ў сьпісах круглыя суткі стаіць парадкавы нумар, пад якім жыве чалавек. "Салдат сьпіць — служба ідзе", — кажуць у войску. Амаль тое самае можна пачуць у турме: "Абы дзень прайшоў, а начы ня ўбачым". Улада невыпадкова штовечар і штораніцы шыхтуе на пляцы і пералічвае сваіх ахоўнікаў і зьняволеных: яна ведае, што ноч — найзручнейшы час для дэзэртырства ня толькі душой, але і целам.

У сваім целе чалавек звычайна жыве сам, у сваёй краіне — разам зь іншымі. Толькі разам з паплечнікамі можна вытрымаць цяжар цывілізаванага ладу жыцьця зь ягонымі палітыкай, эканомікай і культурай. Для мовы, гісторыі і ўвогуле грамадзкага жыцьця трэба, каб людзей было шмат, для фізыялягічных жа працэсаў (бегу крыві, вырошчваньня валасоў і г.д.) дастаткова і аднаго цела.

Цела — ня больш чым падмурак чалавека. Але калі б у нас не было такога падмурку — мы б рассыпаліся на тысячы аўтаномных думак, памкненьняў і рысаў характару (што, мабыць, звычайна і адбываецца ў выніку сьмерці). Цела — гэта спалучальная тканка паміж усімі сацыяльнымі ролямі, выявамі, нумарамі, імёнамі і псэўданімамі чалавека (як маўчаньне — паміж словамі, а зямля — паміж нябёсамі розных рэлігіяў). Невыпадкова дзьвюма галоўнымі тэндэнцыямі сучаснага мастацтва і самога ладу жыцьця сталіся, з аднаго боку, усё хутчэйшае мільгаценьне незавершаных вобразаў і ўчынкаў, абарваных на паўслове навінаў, а з другога — падкрэсьленая ўвага да цела як да найбольш надзейнага апірышча ў гэтым заблытаным і фрагмэнтарным сьвеце, гаранту тоеснасьці чалавека самому сабе, нашай *партатыўнай радзімы*.

У старажытнасьці і нават за нядаўнім таталітарным рэжымам усяго было вельмі мала — і навінаў, і смачнай ежы, і хатніх рэчаў, — але кожная падзея ці ўласная думка мела глыбокі сэнс і здавалася невыпадковай. Сучасны чалавек жыве ў сьвеце, дзе ўсяго нібыта шмат, але ўсё нейкае павярхоўнае, выпадковае

і ня мае ніякага агульнага сэнсу. Усе мэтафізычныя праблемы страцілі сваю ранейшую вагу, бо найбольш актуальнаю сталася праблема вагі ўласнага цела.

Аналяг чаргі ў будысцкай філязофіі — кругабег сьмерцяў і нараджэньняў (самсара), у хрысьціянскай — “дурная бясконцасьць” чалавечага роду. Кафка аднойчы ў дзёньніку прыйшоў да высновы, што Сызыф быў бязьдзетны. Нават калі і сапраўды так, то сам ён, безумоўна, быў чыймсьці сынам. Мы спадзяемся, што нараджэньне дзіцяці будзе для нас выхадам з бессэнсоўнага кола аднолькавых учынкаў і думак. Гэта выхад для нас, але не для яго.

Чалавек бясконца пераходзіць з адной чаргі ў іншую, пакуль шукае самарэалізацыі. Уся нашая маёмасьць, а таксама веды і ўлада — гэта сызыфаў камень, які і валачы цяжка, і кінуць страшна: бязь іх нічога ад нас у гэтым сьвеце не застанецца. Ня толькі багацей, але нават той, хто ўсьведамляе сябе жабраком, ня здолее праляцець скрозь вушка іголкі на неба: ганарыцца багацьцем альбо скардзіцца на галечу — адно і тое ж, па вялікім рахунку.

Каб спыніць паўторнае, недасканалае існаваньне і выйсьці з будысцкага кола пакутаў ці хрысьціянскага кола грахоў (у якім кожны дзень набліжае сьмерць і аддаляе выратаваньне), дастаткова адмовіцца ад жаданьня стаць першым альбо здабыць сабе нейкі іншы прэстыжны нумар. Буда дасягнуў прасьвятленьня тады, калі ўсьвядоміў, што межаў самаўдасканаленьня (ня кажучы ўжо пра ўдасканаленьне сьвету) няма. Чалавека трымае на ланцугу не само імя (сваё ці чужое), а жаданьне любым коштам праславіць яго ці, наадварот, забыць.

Сваім аднастайным, мэханічным, але ў той самы час жывым рытмам, падобным да пульсацыі крыві ў целе і звыклых думак у розуме, чарга мацуе дух, вучыць не саромецца паўтараць іншых людзей нават у такой маланадзейнай справе, як чалавечае жыцьцё. У самім рытме ранішняй гімнастыкі, нудотнай працы на канвэеры, танцаў і, перадусім, дыханьня ёсьць штосьці сэнсатворнае. Якое заўгодна, нават знарочыста абсурднае дзеяньне, калі яго паўтараць штодня, неўзабаве ператвараецца ў сакральны рытуал, вакол якога можна будаваць і ўсё астатняе жыцьцё. Для нараджэньня мовы ў свой час было дастаткова, каб людзі ўпарта паўтаралі, напачатку без аніякага сэнсу, абмежаваны набор гукаў. І гісторыя, відаць, нарадзілася зь нейкіх неасэнсаваных учынкаў, якія выпадкова сталіся працягам адзін аднаго.

Усе нашыя чэргі, канвэеры, колазварот імёнаў і лічбаў складаюцца ў сусьветную павуту цывілізацыі. Мы ад самага пачатку жывем у “інтэрнэце” калектыўнага бесьсьвядомага, лунаючых у паветры ідэяў, агульных учынкаў. Гісторыю лепш маляваць не як узыходзячую лінію, сьпіраль ці кола, а як сетку, дзе ёсьць усе геамэтрычныя фігуры. У гэтым лябірынце можна бясконца паўтараць свае ці чужыя словы і жэсты, але можна ўсё ж такі рухацца й наперад у надзеі знайсьці калі-небудзь выйсьце. Гісторыя — гэта ня толькі бясконцы тупік, але і бязьмежны парог. Нават стойма на месцы мы кудысьці ідзем.